16.50 Сериал «Любовь и тайны Сансет Бич».
17.40 Криминал.
18.40 Детектив «Шерлок Холмс и доктор Ватсон». «Кровавая надпись».
20.00 Намедни-63.
20.35 Профессия - репортер. Алексей Михалев. «Полночное солнце».
21.45 Сериал «Солдаты удачи».
22.40 Сегоднячко.
23.20 Криминал.
23.35 «Антропология».



14.00, 17.00 ТСН-6.
14.10 «Знак качества».
14.20, 22.30 Телемагазин в Минске.
14.40 Сериал «Просто Мария».
15.30 Мультсериал «Головокружительные приключения Билли и Теда».
15.55 Сериал «Готовы или нет».
16.25 ДИСК-канал.
17.20, 21.50 Дорожный патруль.
17.30 Сериал «Грейс в огне II».
17.55 Сериал «Династия II. Семья Колби».
19.00 «Новости дня».
19.30 «О.С.П-студия».
20.25 «В мире людей».
21.00 Сериал «Вавилон 5».
22.05 Шесть новостей дня.
22.15 Те Кто.
23.05 Сериал «Дневники Красной туфельки».
23.30 Сериал «Грейс в огне II».




18.00, 21.40 Погода на завтра!
18.05 Программа Кеннета Коупленда.
18.25, 20.25, 21.55 У стойки бара.
18.30 Мультфильм «Каран и волшебный котел», 2 часть.
20.00 Новости «К-видео» (информация о фильмах, прошедших классификацию Госрегистра).
20.30 Вечарніца.
20.45 Телесериал «Влюбленный д'Артаньян»..
21.45 Отбой.
22.00 Кинокомедия «Берегись автомобиля».
23.45 Погода на завтра.

ПЯТНИЦА • 23 ИЮЛЯ



6.30 Доброе утро, Беларусь!
7.00 Новости.
7.10 Доброе утро, Беларусь!
8.15 Политические диалоги.
8.40 Потребительская корзина.
9.00 Новости.
9.10 Дневник Международного фестиваля искусств «Славянский базар в Витебске-99».
9.30 Детский экран. «Все дело в шляпе».
9.55 Мультфильм.
10.05 Уроки Н.Новожиловой.
10.30 Усадьба.
11.00 Новости.
11.10 Новые имена.
11.20 «Верность любви». Сериал.
11.55 Сделано в Беларуси. СП «Лукойл - Беларусь».
12.10 Четвертое измерение.
12.35 Мультфильмы.
13.00 Новости.
13.10 «Рыжий, честный, влюбленный». Худ.фильм. 2-я серия.
14.25 «Веселая радуга». Фильм-концерт.
15.00 Новости.
15.10 Сериал для детей. «Боишься ли ты темноты?» (Канада).
15.35 Судьба моя и надежда.
16.00 Регион. Передача из Витебска.
16.25 «Риск-версия». Телеигра.
17.00 Новости (с сурдопереводом).
17.15 «Древо жизни». Телеочерк.
17.40 Наш край. «Беларусь в зеркале мемуаров». Рассказывает Адам Мальдис.
18.05 «Верность любви». Сериал.



18.40 Дневник Международного фестиваля искусств «Славянский базар в Витебске-99».
19.00 Новости.
19.15 «Сегодня с вами...» Профессор, кардиохирург Вячеслав Янушко.
19.40 Международные спортивные новости.
20.00 Добрый вечер, Беларусь! В программе: «Разговор в прямом эфире», «Что делать?», рубрика «Зоовести».
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.30 «Славянский базар в Витебске-99». Международный конкурс молодых исполнителей эстрадной песни. День первый. Трансляция из Витебска.
23.40 Ток-шоу «Карамболь» на «Славянском базаре».
0.05 Новости.
0.15 Криминальная хроника.
0.20 Таиландский бокс. Международный турнир.



05.00 Телеканал «Доброе утро».
08.00, 11.00, 14.00, 17.00, 22.40 Новости.
08.15 Сериал «Во имя любви».
09.15 Маски-шоу.
09.40 Смак.
10.00 Мультсеанс: «Заяц, который любил давать советы».
10.10 Сериал «Звездные войны».
13.30 Программа «Вместе».
14.15 Приключенческий фильм «Путешествие Нетти Ганн».
16.00 Сериал «Во имя любви».
17.15 Телесериал «Графиня де Монсоро».
18.15 Док.детектив. «Дневник убийцы. Дело 1996 года».
18.45 «Ералаш».
19.00 Поле чудес.
20.00 Время.
20.40 Погода.
20.45 Детектив «Двойной удар».
22.10 Людмила Кучма в программе «Женские истории».
22.55 Триллер «Шепот».



06.00 Доброе утро, Россия.
06.20 У всех на устах.
06.45 Телеигра «Программа передач».
07.15 Тысяча и один день.
08.15 Дежурная часть.
08.45 Товары - почтой.
09.10 «Миледи». Сериал.
10.00, 16.00, 19.00, 23.10 Вести.
15.25 «Первые поцелуи». Сериал.
16.30 «Башня».
17.00 Гомеопатия и здоровье.
17.05 Комедия «Первая ласточка».
18.25 «Да, господин премьер-министр». Сериал.
19.40 Подробности.
19.55 «Городок».
20.25 Комедия «Земные девушки легко доступны».
22.20 Подиум д'арт.
22.55 Дежурная часть.
23.40 Дневник фестиваля «Славянский базар в Витебске».
00.05 Прогноз погоды.



07.05, 11.30, 13.30, 19.30, 23.00 Новости культуры.
07.25 «Закрытая книга». В.Каверин.
08.05 Консилиум.
08.35 «Люди театра». В.Самойлов.
09.05, 21.40 «Айрик». Худ. фильм.
10.25 «Карильон». Конкурс звонарей в Бельгии.
10.50 «Российский курьер». Якутия.
11.40, 20.45 После новостей...
12.00 «Откровение». М.Кабаков.
12.15 Художник М.В.Нестеров.
13.00 «Время музыки». Тележурнал.
13.45 «Путешествие к Чехову». Фильм 2-й. «Знаменитость № 877».
14.50 Живое дерево ремесел.
15.00, 17.30 Новости.
15.10 «Лукоморье».
15.30 «История принцессы-гусыни». Худ. фильм.
16.50 «Картина». Телеспектакль.
17.40 Страна Фестиваля.
18.05 Очевидное-невероятное. Век XXI.
18.35 Поет М.Биешу.
18.45 «Кто там...» Авторская программа В.Верника.
19.10 Чудо-сказка.
19.50 «Царская ложа». Ульяна Лопаткина.
20.30 Власть факта.
21.05 «Кумиры». Е.Шварц.
21.30 Играет Федерико Мондельчи.



06.00 «Сегодня утром».
08.10 Сериал «Солдаты удачи».
09.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
09.20 Детектив «Шерлок Холмс и доктор Ватсон». «Кровавая надпись».
10.30 Криминал. «Чистосердечное признание».
11.30 «Старый телевизор» вспоминает...
13.30 Сериал «Доктор Куин, женщина-врач».
14.20 Сегоднячко.
15.30 Сериал «Нью-Йорк. Центральный парк».
16.25 Впрок.
16.50 Футбольный клуб.
17.40 Криминал.
18.35 Детектив «Приключения Шерлока Холмса и доктора Ватсона». «Король шантажа».
19.50 Намедни-64.
20.30 «Итого».
21.45 «Криминальная Россия. «Как украсть миллиард».
22.15 Худ.фильм «Мамочка - маньяк-убийца».



05.55 День за днем.
07.45 Дорожный патруль.
08.00, 10.00, 12.00, 14.00 ТСН-6.
08.10 Те Кто.
08.25 СВ шоу.
08.50 Телемагазин в Минске.
09.00 Сериал «Династия II. Семья Колби».
09.50 Телемагазин в Минске.
10.10 Наша музыка. «Машина времени».
11.10 Сериал «Вавилон 5».
12.10 День за днем.
14.10 «Знак качества».
14.20 Телемагазин в Минске.
14.40 Сериал «Просто Мария».
15.30 Мультсериал «Головокружительные приключения Билли и Теда».
15.55 Сериал «Готовы или нет».
16.25 ДИСК-канал.
17.00 ТСН-6.
17.20 Дорожный патруль.
17.30 Сериал «Грейс в огне III».
17.55 «Шоу Бенни Хилла».
19.00 «Новости дня».
19.30 «Скандалы недели».
20.00 «ОБОЗ».
20.55 Триллер «Дух мщения».
22.45 Дорожный патруль.
23.00 Шесть новостей дня.
23.10 Те Кто.
23.25 «Радио-хит».
00.30 Сериал «Грейс в огне III».




18.00, 21.25 Погода на завтра.
18.05 Программа Кеннета Коупленда.
18.25, 20.25 Мой дом, моя крепость.
18.30 Художественный фильм «Василий Буслаев».
20.00 Holiday USA.
20.30 Вечарніца.
20.45 Музыка на телеканале.
21.15 Отдых и туризм.
21.30 Между прочим.
21.45 Деми Мур в художественном фильме «Стриптиз».
23.45 Погода на завтра.

СУББОТА • 24 ИЮЛЯ



7.00 Доброе утро, Беларусь!
8.00 Континент.
8.15 Столица.
8.40 Потребительская корзина.
9.00 Новости.
9.10 Дневник Международного фестиваля искусств «Славянский базар в Витебске-99».
9.25 Книгосбор.
9.55 Здоровье. Тележурнал.
10.20 Родное слово. Сколько названий у рушника.
10.50 «Сегодня с вами...» Главный художник г.Минска Алексей Мартынов.
10.15 Вершина мира. Телевикторина.
11.40 Око. О рекламе и не только...
12.05 «Все нормально, мама!» Развлекательная программа.
12.35 Международные спортивные новости.
12.55 Усадьба.
13.20 Новые имена.
13.25 Олимп.
14.00 «Славянский базар в Витебске-99». Государственный концертный оркестр РБ под управлением М.Финберга.
15.30 Новости.
15.45 «Познай себя». Ко Дню пожарной службы.
16.05 Бон тон. Тележурнал моды.
16.35 Ток-шоу «Это моя работа».
17.05 «Пусть тебе приснится Пальма де Майорка». XX летние спортивные игры студентов «Универсиада-99».
17.45 «Театральные истории». Худ. фильм.
18.30 Из достоверных источников.
18.55 Футбол. Чемпионат Беларуси. «Динамо» (Минск) - «Шахтер». В перерыве (19.45) - Дневник Международного фестиваля искусств «Славянский базар в Витебске-99».
21.00 Панорама.
21.30 «Славянский базар в Витебске-99». Международный конкурс молодых исполнителей эстрадной песни. День второй.
23.40 Бездельник.
0.10 Видимо-невидимо.




06.55 Комедия «Слуги дьявола на чертовой мельнице».
08.25 Слово пастыря.
08.45 Домашняя библиотека.
09.00, 14.00, 17.00 Новости.
09.15 Программа «100%».
09.45 Утренняя почта.
10.20 «Каламбур».
10.50 Смак.
11.10 Возвращение Третьяковки. История одного шедевра.
11.35 Экстренный вызов.
12.05 Художественный фильм «Мы двое мужчин».
13.30 Программа «Цивилизация».
14.15 Сериал «Мама, это я!».
14.45 В мире животных.
15.25 Мировой футбол на ОРТ. Чемпионат мира 1998 года. Германия - Хорватия.
17.15 Тема.
17.55 «Ералаш».
18.05 Худ.фильм «Операция «Святой Януарий».
20.00 Время.
20.50 Телесериал «Секретные материалы».
22.30 Фильм «Фейерверк».



07.05 Фильм для детей «4:0 в пользу Танечки».
08.30 Мультфильмы.
08.55 Прогноз погоды.
09.00 Доброе утро, страна.
09.35 Сам себе режиссер.
10.05 «Сто к одному». Телеигра.
10.50 Любовь с первого взгляда.
11.15 Золотой ключ.
11.30 Хорошие новости.
11.45 Мультфильм.
12.05 «Тарзан. История приключений». Сериал.
13.00, 19.00 Вести.
13.30 «Улитки». Худ.фильм.
13.50 Мультфильм.
14.15 Комедия «Асы».
16.00 «Славянский базар в Витебске». Казачий круг.
17.00 Моя семья.
18.00 Старая квартира. Год 1990-й. Часть 1-я.
19.30 Досье. «Сеанс дрессуры с ее полным разоблачением».
20.00 Боевик «Войны роботов».
21.45 «Славянский базар в Витебске». Ночь юмора.
22.50 Дневник фестиваля «Славянский базар в Витебске».
23.00 Звуковая дорожка.



09.10 «Читая Библию». Ветхий Завет.
09.20 «Мировая деревня». «Село Плехово».
09.50 «Песня первой любви». Худ. фильм.
11.30 «Тихоокеанский век». Док. сериал.
12.30 «Аистенок».
13.00 «Рассказы старого сплетника». Авторская программа А.Белинского. «Ираклий Андроников».
13.30 Новости культуры.
13.45 «Дуэт с Александром Пушкиным». Моноспектакль.
14.35 Худ.фильм «Портрет Манон».
15.40 «Весна». Худ.фильм.
17.30 Новости.
17.35 «Цветами убранная юность». И.Мирошниченко.
17.50 «XX век в кадре и за кадром». Иван Пырьев.
18.40 «40 лет с джазом». Г.Гаранян.
19.30 Чудо-сказка.
19.45 «Жерар Филип, принц в толпе». Док.фильм.
21.00 Новости культуры.
21.20 Блеф-клуб.
21.55 «В горах мое сердце». Худ. фильм.
23.05 «Театр одного художника».



07.00, 09.00, 11.00 Сегодня.
07.15 Детектив «Приключения Шерлока Холмса и доктора Ватсона». «Король шантажа».
08.20 Мультфильм «Шут Балакирев».
08.40 «Старый телевизор» вспоминает: «Фитиль».
09.15 Криминал. «Чистосердечное признание».
09.40 Дело хозяйское.
10.20 Худ.фильм «Нигде и никогда».
11.25 Впрок.
11.45 Своя игра.
12.25 Худ.фильм «Печки-лавочки».
14.10 Суд идет. «Государственные дети против государства».
15.00 Сегодня.
15.30 Сериал «Она написала убийство».
16.30 «Антропология».
17.20 Дог-шоу «Я и моя собака».
18.00 Сегодня.
18.35 Худ.фильм «Живет такой парень».
20.25 Весь Жванецкий.
21.00 Сегодня.
21.45 Боевик «Операция отряда «Дельта II».
23.40 Ток-шоу «Про это».
00.25 Худ.фильм «Миранда».



07.05 Дорожный патруль.
07.20 Мультфильмы.
07.45 Мультсериал «Сказки братьев Гримм».
08.10 Сериал «Марко Поло».
09.05 Сериал «Робин Гуд».
10.00 Шоу «Чердачок».
10.20 Путешествия с «Национальным Географическим Обществом». «Дикая жизнь Мадагаскара».
11.20, 11.50 Телемагазин в Минске.
12.05 «Моё кино» с В.Мережко.
13.45 Программа А.Политковского «Территория ТВ-6».
14.10 «Это - Жириновский!».
14.40 Худ.фильм «Макаров».
16.20 Телемагазин в Минске.
16.35 Сериал «Флиппер III».
17.20 «Любишь - смотри».
17.30 Дорожный патруль.
17.45 Сериал «Найтмен».
18.30 СВ шоу.
19.05 Худ.фильм «Гардемарины-3».
20.55 Те Кто. Элтон Джон.
21.20 Дорожный патруль.
21.30 Шесть новостей дня.
21.40 «Любимый город». Концерт, посвященный Дню молодежи.
23.05 Плейбой.




15.00 Погода на завтра.
15.05 Джойс Майер «Жизнь в слове».
15.30 Детский экран.
16.00 Многосерийный фильм «Михайло Ломоносов».
18.25 Двенадцать стульев.
18.30 Программа для глухонемых «Блаженны плачущие».
18.55 Двенадцать стульев.
19.00 Художественный фильм «Чарли Шампань», 1 серия.
20.40 Погода на завтра.
20.45 Вечарніца.
20.55 Двенадцать стульев.
21.00 Алек Болдуин в мелодраме «Трамвай желаний».
23.45 Погода на завтра.

ВОСКРЕСЕНЬЕ • 25 ИЮЛЯ



7.00 Доброе утро, Беларусь!
8.00 Сериал для детей **«Добрый дивный день»**. 3-я серия.
8.30 Потребительская корзина.
8.45 Экран - абитуриенту. Письменный экзамен в вузы по белорусскому языку и литературе, по русскому языку и всемирной литературе.
9.00 Новости.
9.10, 19.20 Дневник Международного фестиваля искусств «Славянский базар в Витебске-99».
9.25 «Навстречу». Летний отдых с друзьями.
9.40 Туробъектив.
10.05 «Все нормально, мама!»
10.35 Белорусский дом.
11.05 Арсенал. Программа об армии.
11.30 Международные спортивные новости.
11.50 Сделано в Беларуси. Минский завод безалкагольных напитков, Слуцкий пивзавод, Сморевичский пищевой промышленный комбинат.
12.05 Ко Дню пожарной службы. «На страже жизни». Телеочерк.
12.30 «Рыцари в огне». Музыкальная программа.
13.00 Телевизионный Дом кино. «Кинотавр-99».
13.25 Новые имена.
13.30 Сериал по выходным. **«Династия-2. Семья Колби»**.
14.15 Сельчане. Ганцевичский район.
14.40 Новости.
14.50 Чемпионат мира по автогонкам «Формула-1». Гран-при Австрии.
17.00 «Зорная ростань» на «Славянском базаре в Витебске-99».
17.30 Теленавигатор.
17.55 Л.Дуров и Е.Майорова в худ. фильме **«34-й скорый»**.
19.40 Колыбельная.
20.00 Резонанс.
20.45 Стадион.
21.00 Ток-шоу «Карамболь» на «Славянском базаре».
21.30 Торжественное закрытие Международного фестиваля «Славянский базар в Витебске-99». День культуры России.
23.50 Авто-парк.
24.00 Премьера песни.



07.00 Мультсеанс.
07.15 Фильм **«Новый Гулливер»**.
08.30 «Дисней-клуб»: «Русалочка».
09.00, 14.00 Новости.
09.15 «Непутевые заметки».
09.30 Пока все дома.
10.10 Утренняя звезда.
10.55 Служу России!
11.30 Играй, гармонь любимая!.
12.00 Крестьянские ведомости.
12.35 Сериал **«Все путешествия команды Кусто»**.
13.25 Смехопанорама.
14.15 Здоровье.
14.45 Клуб путешественников.
15.35 «Дисней-клуб»: «Чип и Дейл».
16.00 «Дисней-клуб»: «Аладдин».
16.30 Телеигра «Колесо истории».
17.20 «Я пришел дать вам волю». К 70-летию Василия Шукшина.
18.05 Худ.фильм **«Калина красная»**.
20.00 Время.
20.40 Шпионский фильм **«Русский отдел»**.
22.50 Футбольное обозрение.
23.20 Ольга Волкова в программе Андрея Макаревича «Абажур».
23.50 Сериал **«Золотые годы Стивена Кинга»**.



07.30 Служу Отечеству!
08.00 Сельские вести.
08.25, 00.00 Прогноз погоды.
08.30 Почта РТР.
09.00 Доброе утро, страна.
09.30 «Аншлаг» представляет.
10.00 «Городок».
10.30 Устами младенца.
11.00 Русское лото.
11.40 Мир книг с Л.Куравлевым.
11.55 «Славянский базар в Витебске». «Радуга над Витебском».
13.00 Вести.
13.30 Федерация.
14.10 «На здоровье!». Ток-шоу.
15.10 **«Закон и порядок»**. Сериал.
16.00 Диалоги о животных.
17.00 Фестиваль солдатской песни «Виктория».
18.35 Худ.фильм **«Криминальный квартет»**.
20.15 «Славянский базар в Витебске». Конкурс молодых исполнителей эстрады.
22.15 Мастер-ралли-99.
22.35 «Уловка-22».
23.30 Дежурная часть.



09.10 «Читая Библию». Ветхий Завет.
09.20 **«Бал сказок»**. Худ.фильм.
10.25 Книжный кладезь.
10.40 «Консилиум».
11.05 «Экспедиция «Чиж». «Дебри усурийские».
11.30 «Аистенок».
12.00 Страницы театральной пародии.
12.50 Телесуфлер.
13.05 «Тарханы. Новая жизнь». Доммузей М.Ю.Лермонтова.
13.30, 21.00 Новости культуры.
13.45 «Следы в океане. Хроника двух кругосветок». Док.фильм.
14.40 Дорога к Пушкину.
14.50 «С потолка». Программа О.Басилашвили.
15.15 «Кинопанорама Встречи».
15.45, 17.35 «Безумный день, или Женитьба Фигаро». Спектакль.
17.30 Новости.
18.55 Авангард Микаэла Таривердиева.
19.25 Чудо-сказка.
19.40 «Элегия». Док.фильм.
20.10 Вокзал мечты.
20.35 «Смерть и жизнь художника Федотова». Док.фильм.
21.20 «Солдат». Фильм-балет.
21.55 **«Неугомонный жених»**. Худ. фильм.
22.45 М.Легран и Т.Гвердцители в Нью-Йорке с остановкой в Витебске.



07.00, 09.00, 11.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
07.15 Худ.фильм **«Пятнадцатилетний капитан»**.
08.40 «Старый телевизор» вспоминает»: «Фитиль».
09.15 Худ.фильм **«Живет такой парень»**.
11.20 Телеигра «Пойми меня».
11.50 Худ.фильм **«Поход северного оленя»**.
12.20 Худ.фильм **«Я свершил правосудие»**.
15.30 Профессия - репортер.
15.45 Свадьба.
16.15 Сериал **«Она написала убийство»**.
17.05 **«Неизвестная война»**. Фильм 9-й. «Война в воздухе».
18.30 Худ.фильм **«Белый шквал»**.
21.45 Куклы.
22.00 Детектив **«Ангельская пыль»**.




07.05 Дорожный патруль.
07.20 Мультфильмы.
07.45 Сериал **«Марко Поло»**.
08.35 Сериал **«Робин Гуд»**.
09.30, 11.25 Телемагазин в Минске.
10.00 Вкусная передача «Пальчики оближешь».
10.30 Канон.
11.00 Шесть новостей недели.
11.40 Худ.фильм **«Вечность»**.
13.50 Телемагазин «Спасибо за покупку!».
14.05 Мультфильм.
14.25 «Спартак-чемпион».
14.55 «Звезды о звездах». Марина Хлебникова.
15.20, 16.25 «Любишь-смотри». Видеоклипы.
15.35 Народно-политическая забава «Президентские гонки».
16.35 Катастрофы недели.
17.30 Дорожный патруль. Сводка за неделю.
17.50 Программа «БИС».
18.25 «Вы - очевидец».
18.55 Мелодрама **«Любимая женщина механика Гаврилова»**.
20.20 Мюзикл **«Короли Мамбо»**.
22.10 Наша музыка. Натали.
23.10 Эротический триллер **«После полуночи»**.



15.00, 21.10 Погода на завтра.
15.05 Программа Рика Реннера.
15.30 Детский экран.
16.00 Многосерийный фильм **«Михайло Ломоносов»**.
18.25, 19.25 Весь мир на ладони.
18.30 Программа для глухонемых «Блаженны кроткие».
19.00 Криминальная программа В.Новицкого «Атас».
19.30 Художественный фильм **«Чарли Шампань»**, 2 серия.
21.15 Вечарніца.
21.30 Новости «К-видео».
21.55 Весь мир на ладони.
22.00 Ш.Стоун в худ. фильме **«Дневник наемного убийцы»**.
23.45 Погода на завтра.

Адкрыць Балканы

Мілошавіч саступіў ваеннай дапамозе NATO, і мы можам уздыхнуць з палёгкай. Каб апраўдаць нашую інтэрвенцыю, мы цяпер павінны забяспечыць лепшую будучыню не толькі для жыхароў Косава, але і для ўсяго рэгіёна, уключаючы астатнюю частку Югаславіі. Мы не можам далей адказваць на крызісы па меры іх узнікнення, асабліва тады, калі нашыя дзеянні могуць мець такія непрыемныя непрадугледжаныя наступствы. Нам трэба пакласці пачатак пазітыўнаму і канструктыўнаму бачанню, бачанню таго плана, што склаў Еўрапейскі Саюз.



Джордж СОРАС

Балканы не могуць быць адроджаны толькі на аснове адных нацыянальных дзяржаваў. Мы ўпэўніліся ў тым, што спробы дамагчыся этнічнай аднароднасці могуць прывесці да невыноснай жорсткасці, людскіх пакутаў і разбурэння. Такі падыход таксама непрактычны. У Югаславіі, за выключэннем Косава, па-ранейшаму застаецца ад 20 да 25 працэнтаў несербскага насельніцтва. Адзіны шлях да міру і дабрабыту — фармаванне адкрытага грамадства, у якім дзяржава не адыгрывае дамінуючай ролі, а межы становяцца не такімі ўжо і важнымі. Менавіта такі шлях выбраў Еўрапейскі Саюз.

Ідэю адкрытага грамадства ўпершыню прапанаваў Анры Бергсан у сваёй працы "Дзве крыніцы рэлігіі і маральнасці", напісанай у 1932 годзе. Ён адрозніваў родавае і ўсеагульнае панятце маральнасці. Першае вядзе да закрытага грамадства, другое — да адкрытага. Гэтая канцэпцыя ў далейшым была распрацаваная Карлам Поперам у яго знакамітай кнізе «Адкрытае грамадства і яго ворагі», у якой ён паказаў, што адкрытаму грамадству таксама могуць пагражаць універсальныя ідэі, калі яны прэтэндуюць на абсалютную ісціну, але праблемы рэгіёна найлепшым чынам можна зразумець, выкарыстоўваючы фармулёўку Бергсана. Мы былі сведкамі барацьбы паміж этнічнай і грамадзянскай канцэпцыямі грамадства. У Югаславіі грамадзянская канцэпцыя пацярпела паражэнне, і Югаславія дэзінтэгравала. У Заходняй Еўропе грамадзянская канцэпцыя атрымала перамогу, і інтэграцыя Еўропы рэзка кантрастуе з распадам Югаславіі. Цяпер Еўрапейскі Саюз павінен узяць пад сваё крыло ўвесь рэгіён.

Сам па сабе рэгіён павінен азначаць нешта большае, чым былая Югаславія, паколькі «Шалтая-Балтая нельга зноў сабраць». У рэгіён павінны быць уключаныя Албанія і Балгарыя, і трэба пакінуць яго адкрытым для такіх краінаў, як Румынія і Малдова. Мы не павінны паўтараць памылак, якія зрабілі ў Босніі. Адраджэнне Босніі не змагло атрымаць дастатковы імпульс, паколькі памер тэрыторыі вельмі малы, і розныя ўрадавыя структуры, ад мясцовых да федэральных, жадалі запусціць не вельмі чыстыя пальцы ў кожны кавалачак пірага. На гэты раз мы павінны заняцца рэгіёнам у цэлым і падтрымаць прыватнае прадпрымальніцтва.

Гэты момант вельмі добра разумеюць нашыя палітычныя лідэры. Пакт стабільнасці ў Паўднёва-Усходняй Еўропе, падпісаны 10 чэрвеня ў Кёльне, служыць добрым адпраўным пунктам. У Пакце закладзеныя тры планы работы: па дэмакратызацыі і захаванні правоў чалавека, па эканамічнай рэканструкцыі, развіцці і супрацоўніцтве, і па пытаннях бяспекі. Пакт прапануе схему, якую трэба напаўняць зместам. Змест можна ўзяць з матэрыялаў, падрыхтаваных Цэнтрам па вывучэнні еўрапейскай палітыкі (CEPS) у Брусэлі.

Ядро плана, узятага з апублікаваных CEPS матэрыялаў, складаецца з чатырох узаемазвязаных крокаў:

1) Краіны-ўдзельніцы інтэгруюць свае мытні, спачатку ў межах Паўднёва-Усходняй Еўропы, затым — у межах Еўрапейскага Агульнага Рынку.

2) Еўрапейскі Саюз кампенсуе з свайго бюджэту падзенне даходаў краінаў ад мытных збораў. Кампенсацыя павінна істотна перавышаць страты ад падзення мытных збораў, што паслужыла б моцнай матывацыяй для ўдзелу. Штогадовая нагрузка на бюджэт ЕС склала б у рэгіёне 5 мільярдаў еўра. Гэтая лічба найлепшым чынам упісваецца ва ўзгодненны ў Берліне бюджэт Еўропы-2000.

3) Гэтая субсідыя будзе строга ўвязаная з прагрэсам у справе стварэння ўмоваў для ўзнікнення адкрытага грамадства: свабодных выбараў, незалежных сродкаў масавай інфармацыі, улады закона, празрыстасці, адмовы ад палітычнага ўмяшальніцтва ў эканамічную дзейнасць.

4) Пры садзейнічанні ЕС краіны будуць здольныя выкарыстоўваць еўра (альбо нямецкую марку да моманту ўвядзення еўра) у якасці адзінай валюты.

На першым этапе гэта прывяло б да стварэння зоны свабоднага гандлю накшталт Бенілюкса. Як толькі ЕС задаволяць захады па мытным кантролі, ён прыядnae гэтую зону да Еўрапейскага Агульнага Рынку. Гандаль сельскагаспадарчай прадукцыяй, якая з'яўляецца асноўнай крыніцай даходу рэгіёна, можа застацца прадметам абмежаванняў, але ЕС будзе павінен праявіць пэўную шчодрасць для забеспячэння поспеху плана.

У бліжэйшай будучыні, скажам, праз два гады, зона можа быць прынятая ў Еўрапейскі Агульны Рынак. У больш аддаленым будучыні краіны адна за адной таксама атрымаюць поўнае членства.

Балгарыя ўжо мае статус кандыдата, і ўдзел у плане дапамог бы ёй хутчэй выканаць патрабаванні для атрымання поўнага членства. Харватыя таксама павялічыла б свае шанцы стаць кандыдатам, нягледзячы на тое, што ёй трэба пераадолець галоўную перашкоду: цяперашнія выбары праходзяць у далёка не дэмакратычных умовах. Сербіі, каб адпавядаць патрабаванням, таксама прыйшлося б правесці выбары пад наглядам OSCE, але Мілошавічу было б вельмі цяжка супрацьстаяць уціску грамадскасці, жадаючай удзельнічаць у плане. План завершыў бы тое, што не змаглі зрабіць бамбардзіроўшчыкі.

Мытні не проста размяжоўваюць краіны; дзяржавы таксама з'яўляюцца наймацнейшай крыніцай карупцыі. Адмена мытных збораў скарацíла б здольнасць урадаў умешвацца ў эканамічнае развіццё; яны павінны былі б канкураваць за прыцягненне інвестыцыяў на свае тэрыторыі, замест таго, каб ствараць перашкоды — як яны гэта робяць цяпер. Спачатку ўзнос Еўрапейскага Саюза быў бы шматразова памножаны прыватнымі інвестыцыямі. Менавіта гэты фактар зрабіў План Маршала такім паспяховым.

План стварэння адкрытага грамадства ў Паўднёва-Усходняй Еўропе прывёў бы да некаторых затратаў з боку краінаў-членаў ЕС, але яны былі б невялікія, паколькі ў эканамічным сэнсе ўвесь рэгіён у цэлым меншы, чым Нідэрланды. Выдаткі наўрад ці пераўзышлі б кошт ваенных і гуманітарных інтэрвенцыяў, але выгада была б параўнальна вышэйшай. ■

Project Syndicate, July 1999



МІЖНАРОДНЫЯ АДНОСІНЫ

«Непакоіць дэфіцыт публічных свабод»

Пасол Францыі ў Беларусі Бернар ФАСЬЕ адказаў на пытанні беларускіх журналістаў

Алег **ГРУЗДЗІЛОВІЧ**

На гэтым тыдні Францыя адзначыла нацыянальнае свята — Дзень узяцця Бастыліі. 210 гадоў таму пачалася Вялікая французская рэвалюцыя, вынікам якой стала падзенне манархіі ў Францыі, а потым і значная перабудова парадкаў ва ўсёй Еўропе. Напярэдадні свята пасол Францыі ў Беларусі Бернар Фасье адказаў на пытанні журналістаў.

— Спадар Фасье, ці заплаціў беларускі ўрад за французскую рэзідэнцыю ў Драздах?

— Напрыканцы мінулага года мы заключылі з вашым урадам пагадненне аб стварэнні двухбаковай камісіі, якая зоймецца вызначэннем памеру кампенсацыі. Хутка наш бок прадставіць гэтай камісіі сваю калькуляцыю. Думаю, што ў рэшце рэшт пытанне будзе закрытае.

— Вы не збіраецеся з'язджаць з Мінска пасля 20 ліпеня?

— Наконт 20 ліпеня нашая пазіцыя зразумелая. Лепшы сродак атрымаць легітымнасць — гэта правесці дэмакратычныя выбары. Такі парадак існуе ва ўсім цывілізаваным свеце. І я не думаю, што Беларусь сапраўды збіраецца жыць па іншых нормах.

— Вы маглі б даць параду, як выйсці з такога канстытуцыйнага тупіка, у якім апынулася Беларусь?

— На маю думку, адзіны сродак рыхтаваць будучае — гэта выйсці з палітычнай канфрантацыі, што і дасць умовы для дэмакратычных выбараў. А гэта можна зрабіць толькі шляхам перамоваў. Трэба ўсім бакам зразумець простую рэч: нельга кіраваць машынай, увесь час гледзячы толькі ў люстэрка задняга віду. Праблему, якая стаіць перад Беларуссю, лепш разглядаць канкрэтна: ёсць Канстытуцыя 1994 года, якую прызнае ўвесь свет, але і сённяшнюю рэальнасць не абмінуць. Яе трэба ўлічваць у сваіх рашэннях і дзеяннях.

— Як вы ацэньваеце сённяшнія эканамічныя рэаліі Беларусі?

— І ў эканоміцы, і ў палітыцы, у забеспячэнні людзей грамадзянскімі свабодамі, безумоўна, ёсць складанасці, якія не паляпшаюць жыццё народу Беларусі. Мы думаем, што толькі дэмакратычны шлях развіцця вашай краіны здольны забяспечыць паступовае знікненне гэтых праблемаў. ■

Ціцянкову спатрэбіліся нарачанскія сосны



Іван Ціцянкоў — кароль беларускіх джунгляў

Алесь ДАШЧЫНСКІ

Кіраўніцтва справамі прэзідэнта плануе забраць яшчэ каля 136 тысяч гектараў вельмі прывабных лясных тэрыторыяў, вадаёмаў Мядзельскага, Вілейскага, Смаргонскага і Пастаўскага раёнаў. На гэты конт падрыхтаваны праект адпаведнай урадавай пастановы.


«Заўхоз» Іван Ціцянкоў ужо валодае вялікай запаведнай тэрыторыяй — Белавежскай пушчай, Прыпяцкім і Бярэзінскім запаведнікамі, Браслаўскімі азёрамі. Нястомнаму Івану Іванавічу так спадабаліся гэтыя прыбытковыя вотчыны, што ён маркуе стварыць яшчэ адну — нацыянальны парк «Нарачанскі». Праект адпаведнай пастановы быў падрыхтаваны яшчэ ў лістападзе мінулага года, але прэм'ер-міністр не знайшоў для гэтай задумы грошай. Акрамя таго, не пагадзіўся перадаць частку маёмасці на гэтай тэрыторыі старшыня Беларускага саюза спажывецкіх таварыстваў Віктар Уладыка. Аднак Іван Ціцянкоў ідзе да сваёй мэты, як белавежскі зубр, і з невялікімі зменнямі праект адпаведнай пастановы зноў накіраваны ва ўрад.

Згодна з гэтым дакументам, міністэрства фінансаў павінна выдзеліць сродкі ўпраўленню справамі прэзідэнта для вядзення лясной і паляўнічай гаспадаркі на новых тэрыторыях, на распрацоўку тэхнічных праектаў. Міністэрства лясной гаспадаркі павінна перадаць Івану Іванавічу асноўныя фонды і матэрыяльныя каштоўнасці Мядзельскага лясгаса. Трэба адзначыць, што тутэйшыя лясы багатыя каштоўнай дрэўнінай, а, як вядома, прамысловыя цэхі па перапрацоўцы і нарыхтоўцы дрэўніны Ціцянкоў запусціў нават у Белавежскай пушчы. Гэтая дрэўніна ідзе на продаж. У праекце стварэння нарачанскага парку таксама прадугледжваецца так званая «санітарная ачыстка тэрыторыі». Не менш каштоўным на гэтых тэрыторыях з'яўляецца возера Нарач разам з курортнай зонай і шмат іншых прыгожых, багатых рыбай вадаёмаў. Іван Іванавіч збіраецца забраць доследную рыбную гаспадарку «Нарач» разам з сажалкамі-гадавальнікамі Шэметава і Скок, нарачанскі завод безалкагольных напояў, усе крамы, рэстаран «Азёрны» і нават аўтастаянку. Аднак не толькі на гэтыя аб'екты паклаў вока Ціцянкоў. У курортнай зоне не менш каштоўнымі з'яўляюцца знакамітыя ўстановы для адпачынку і аздараўлення, пагэтаму ўпраўленне справамі прэзідэнта адбярэ ў іншых ведамстваў гатэль, аўтакемпінг «Нарач», а таксама санаторыі «Будаўнік» і «Прыазёрны». Як бачым, вельмі важкі кавалак атрымае бязмежная гаспадарка кіраўніка справамі.

Для ажыццяўлення свайго праекта Іван Ціцянкоў вырашыў пашырыць колькасць сваіх прыхільнікаў і звазіў на Нарач каля пяцідзесяці дэпутатаў Нацыянальнага сходу, якія наведалі мясцовую славутасць — знакамітую баржу, прыцягнутую сюды некалькі гадоў назад. Гэтае судна ператварылі ў рэстаран, пабудавалі масты і пляцоўку для дыскатэкі. Карабель нарачанцы завуць «Тытанікам», а ахоўваюць яго амонаўцы. Дыскатэкі тут гудзяць штодня да 2 гадзінаў ночы, і кліенты бліжэйшых санаторыяў, уваход у якія зачыняецца ў 23 гадзіны, ужо не аднойчы скардзіліся мясцовым уладам на занадта шумныя начныя гулянкі, што перашкаджаюць адпачынку. Толькі адзін уваходны квіток у рэстаран і на дыскатэку «Тытаніка» каштуе адзін мільён рублёў, і пагэтаму даступны ён адпаведнаму кантынгенту, які прыязджае сюды «адцягнуцца».

Гэты карабель і некалькі атракцыёнаў (водная горка, «банан», катамараны) належаць закрытаму акцыянернаму таварыству «Нарач», сузаснавальнікамі якога з'яўляюцца ўпраўленне справамі прэзідэнта, газета «Рэспубліка» і Мядзельскі райвыканкам. Нягледзячы на высокія кошты, забавы не даюць вялікага прыбытку, пагэтаму і ўзнікла ідэя стварэння Нарачанскага нацыянальнага парку. Плаціць тут даводзіцца не толькі за атракцыёны — нават ляжанне на пляжы на адзін дзень выцягвае з кашалька адпачываючых 200 тысяч рублёў. За грошы возіць людзей па курортнай зоне так званы «ціхаходны транспартны сродак» — трактар з некалькімі вагончыкамі, які напаўняе атмасферу клубамі дыму. Гэты экалагічна шкодны апарат рэкламуе газету «Рэспубліка».

У Нарачы трэці тост прынята піць «за каханне». Кажуць, што заняцца гэтым рамествам сюды прыязджаюць дзяўчаты нават з Мінска. Існуе свая такса за паслугі — вечар у рэстаране і дзесяць долараў зверху. Яшчэ адна акалічнасць прыбярэжнай курортнай зоны: у абсталяваных пад кафэ палатках, якія належаць таму ж акцыянернаму таварыству, можна купіць спіртное нават ноччу, хоць на астатняй тэрыторыі раёна мясцовыя ўлады забаранілі начны продаж моцных напояў. Кампаніі праводзяць час на пляжах, выпіваючы па некалькі бутэлек гарэлкі, прычым нікога не бянтэжыць, што тут жа адпачываюць і дзеці. Кажуць, што бармены з гэтых палатак абавязаныя здаваць выручку і яшчэ дзесяць працэнтаў ад яе. Тут працаваць вельмі выгадна, і можна нават пракруціць «левы» тавар. Нельга не адзначыць і той факт, што беларускае шампанскае ў Нарачы каштуе каля 1.200 тысяч рублёў, у Мінску яно таннней у два разы. Даражэйшыя тут і прадукты харчавання. Падсумоўваючы ўсе выдаткі, можна сказаць, што нарачанская курортная зона стала вельмі дарагой для звычайнага беларуса, якога тут абдзіраюць, як ліпку. Калі казаць пра камфорт, дык дастаткова прыгадаць прыбіральні і дарогі. І тое, і іншае ніяк не адпавядае еўрапейскім патрабаванням.



Фота Ул. ШЛАПАКА

Такая ціхая была Нарач, пакуль яе не ўбачыла ўпраўленне справамі прэзідэнта

Значная частка грамадзянаў прыязджае сюды на адпачынак прыватным чынам і здымае кватэры ў жыхароў пасёлка — пакой у суткі на чалавека каштуе 4–5 долараў. Гэта даволі дорага, затое ў нарачанцаў з нізкімі заробкамі і пенсіямі ёсць магчымасць крыху паправіць свой сямейны бюджэт. Не прамінаюць такой магчымасці і мясцовыя ўлады, якія прымушаюць плаціць курортны збор. Тым, хто хоча парыбачыць, таксама патрэбна выкласці адпаведную суму грошай. Што да камфорту, то гарачую ваду тут падаюць у кватэры толькі тры дні на тыдзень. Затое Нарач знаходзіцца недалёка ад Мінска, і гэта вельмі зручна, тым больш, што эпідэміёлагі закрылі мінскія вадаёмы для купання.

Возера Нарач, пра якое напісана столькі прыгожых паэтычных радкоў, таксама далёка не чыстае. Сёлетнім сезонам у купальшчыкаў з'яўляецца ад вады непрыемная высыпка. Шмат хто шукае ў такую спёку больш чыстыя бліжэйшыя вадаёмы. Прыватныя турысты прыязджаюць на сваім транспарце літаральна на бераг знакамітага возера Вялікія Швакшты (яго таксама хоча забраць упраўленне справамі), каб правесці тут выхадныя. Праезд транспарту сюды забаронены природаахоўнымі службамі, але ж для стаянкі месца не абсталяванае, таму іншамарку даводзіцца ставіць каля палаткі.

Усе ведамасныя дамы адпачынку, гатэлі і санаторыі на Нарачы запоўненыя. Пуцёўка ў звычайны санаторый каштуе прыкладна 40 мільёнаў рублёў, а ў здраўніцу «Сосны», якая ўжо належыць упраўленню справамі прэзідэнта, — каля 90 мільёнаў рублёў, і адпачывае тут звычайна наменклатура. Натуральна, дзе большыя кошты, там лепшае абслугоўванне. Раней гэтую ўстанову хацелі перадаць для аздараўлення дзецям Чарнобыля, але справа заглохла.

Нарач — бадай, самая папулярная курортная зона ў нашай краіне — патрабуе развіцця і значна большага фінансавання. Прычым кошты тут трэба разлічваць не на замежных турыстаў, а на жыхароў сваёй краіны. Ці многім, акрамя іншаземцаў, сёння даступныя для адпачынку гатэлі, адбудаваныя Іванам Ціцянковым у тым жа Бярэзінскім біясферным запаведніку? Тое ж самае ён плануе стварыць і ў будучым нарачанскім нацыянальным парку, калі ўлады гэта дазволяць. Жаданне адмываць грошы ў курортнай зоне, мяркуючы ўжо па дзейнасці акцыянернага таварыства, вельмі вялікае. Прычым упраўленне справамі шукае сродкі на новыя праекты ў бюджэце — фактычна, у нашай кішэні. Калі ў Івана Іванавіча так добра пайшлі справы ў іншых запаведніках, як пра гэта пішуць афіцыйныя газеты, то няхай ён хоць на стварэнне новага парку возьме грошай са сваёй касы, напрыклад, ад прыбыткаў у той жа Белавежскай пушчы ці Бярэзінскім запаведніку. ■

УСХОДНІ НАПРАМАК

Інтэграцыя на ўзроўні масаў

Ідэі аб'яднання прасачыліся з дыпламатычных кабінетаў у беларускую рэчаіснасць у выглядзе «сокалаў» і «беркутаў»

Канстанцін СКУРАТОВІЧ

Вакол аб'яднання Беларусі і Расіі ў адзіную саюзную дзяржаву ўжо столькі ўсяго наварочана, што, як той казаў, чорт нагу зломіць. Бадай толькі некалькі чалавек крочаць па гэтым бураломе больш-менш упэўнена. Сярод іх, напрыклад, Жырыноўскі, якому абы было дзе боты памыць: ці то ў Віслe, ці то ў Індыйскім акіяне. Як паказаў захоп зухаватымі хлопцамі з расійскай ваеннаспартыўнай групы «Беркут» беларускай вёскі Мікалаеўка, у яго і ў іншых «славянафілаў» ёсць паслядоўнікі. Маўляў, Косава далёка, а Бабруйск пад бокам: чаму б яго трохі не пачысціць?

Адзін з мясцовых жыхароў, даволі малады з выгляду, па ўсім не знаёмы з рэчаіснасцю нямецкай акупацыі, назваў «беркутаўцаў» натуральнымі паліцаямі. І ён мае рацыю. Бо любая палітычная гульня, якая палягае ў чаецца ад сутыкнення амбіцыяў і недастаткова акрэсленых інтарэсаў асобных персонаў, непазбежна прыцягвае да сябе спачатку маргіналаў (успомніце, каму чаго няма губляць, акрамя ланцугоў), а потым і ўсіх астатніх незалежна ад таго, хочуць яны гэтага ці не. А з маргіналаў усюды і заўжды ствараліся штурмавыя атрады і іншыя баявыя дружыны. Дарма, што ў расійскіх падлеткаў аўтаматы былі «потешными», ёсць жа і сапраўдныя аўтаматы, і сапраўдныя «сокалы».

Лічу, што «дэпартаваныя» да Смаленска падлеткі прасякнуліся да сябе пачуццём глыбокай павагі і вельмі добра сябе пачувалі па дарозе ў родны Сургут. Тым больш, што і мне было весела назіраць (стужку паказвала тэлебачанне) за тым, як спрытна яны вязалі мясцовую «вертыкаль». Такім пад сілу і Бабруйск. Тым больш, што яны толькі паказалі на справе тое, аб чым на сустрэчы з грамадскасцю Арэнбурга распавядаў Лукашэнка: аб перспектывах роўных правоў грамадзянаў у з'яднаных па мінскім сцэнары Беларусі і Расіі.

Такім чынам, у справе інтэграцыі палітыка і дыпламатыя заканамерна саступаюць месца жывой, як казаў Ленін, творчасці масаў. Бо ў адрозненне ад дыпламатаў, якія могуць гаварыць адно, думаць другое, а рабіць трэцяе, натоўп мысліць заўсёды непасрэдна, канкрэтнымі катэгорыямі, якія правакуюць дзеянне. Гэта палітыкі могуць дазволіць сабе раскошу весці шматгадовую беспаспяховую дыскусію без рызыкі згубіць палітычную патэнцыю. І наадварот, ад беспрадметнай балбатні настрой і здароўе натоўпу толькі псуецца.

Такім чынам, як казаў класік, ідэя інтэграцыі стала матэрыяльнай сілай і ў гэтай якасці цалкам падпарадкоўваецца вядомаму закону, згодна з якім дзеянне заўжды ўраўнаважваецца процідзеяннем. І паколькі дзяржава не можа (не хоча?), што да казаў «Беркут», гарантаваць бяспеку сваіх грамадзянаў на ўласнай тэрыторыі, то гэта становіцца справай саміх грамадзянаў. У гэтай сітуацыі ўжо не маюць ніякага значэння намеры палітыкаў, бо ініцыяваны імі працэс дзялення грамадзянаў на «чыстых і нячыстых» выходзіць з-пад іх кантролю. Палітыкі будуць, канешне, стаяць за большасць, якую яны сфармавалі і на якую абапіраліся, але для меншасці, калі гэта пагражае яе сацыяльнаму і фізічнаму існаванню, гэта ўжо не мае прынцыповага значэння.

Так было напачатку грамадзянскай вайны ў Расіі, так усё пачыналася ў Ічкерыі, так узарвалася Югаславія. Думаць, што інакш будзе ў «талерантнай» Беларусі, калі яе пачнуць «чысціць» розныя сокалы і беркуты, няма ніякіх падставаў. Што б там ні казалі пра волю народаў і іх гістарычны лёс. ■

памяць XX стагоддзя 1912

Манпарнас

Міхал МАТУШ

Карціны трох майстроў, якія на пачатку стагоддзя прыбылі ў Парыж і здымалі майстэрні на Манпарнасе, цяпер, пад канец стагоддзя, упрыгожваюць лепшыя музеі свету і каштуюць мільёны долараў. Іх і невялікае кола такіх жа, але менш знакамітых жывапісцаў, называюць Парыжскай школай. Назва вельмі ўмоўная — ніхто з іх апрыёрна не мог мець паслядоўнікаў і вучняў, бо яны былі геніі.

Пабла Пікасо нарадзіўся ў Іспаніі ў сям'і мастака. Амадэо Мадыльяні паходзіць з сям'і ліворнскіх сефардаў (яўрэяў, што некалі былі змушаныя пакінуць Іспанію). А дзяцінства і юнацтва Марка Шагала прайшло на лёзненскіх і віцебскіх вулках, памяць пра якія прасякае шмат яго твораў.

У 1912 годзе Пікасо было 30 гадоў, Мадыльяні — 27, Шагалу — 24. Яны наведвалі адзін аднаго ў майстэрнях, вечарамі сустракаліся ў кафэ на Манмартры, у коле іх агульных сяброў і знаёмых былі Апалінэр і Ганна Ахматава. На той час усе трое ўжо мелі выстаўкі, вядомасць і пэўнае прызнанне таленту. З гэтай тройцы найменш шанцавала Мадыльяні. Ён ад прыроды меў слабое здароўе, што адбілася на яго нам характары. Схільны да меланхоліі, Мадыльяні моцна залежаў ад крытыкаў, прызнання, а яшчэ больш ад пакупкі сваіх работаў калекцыянерамі і гандлярамі. У гэтым апошнім поспех не спяшаўся да яго. Найбольш намаганняў дзеля продажу яго карцін прыклаў Леапольд Збароўскі, малады паэт, які прыехаў у Парыж з Польшчы, і намагаўся дапамагчы сябру, прапануючы дзе магчыма яго незвычайны жывапіс. Але ўдача прыходзіла вельмі рэдка. Мадыльяні цікавілі выключна людзі, жывая натура. За ўсё жыццё ён напісаў два пейзажы. Адораны ад прыроды надзвычайным талентам, ён паказаў сябе не толькі ў партрэтным жывапісе. Прызнанне пазнейшых крытыкаў заваявала яго ная скульптура. Але калі ў 1913 годзе ён у родным Ліворна паказаў работы сябрам, яны сустрэлі яго творчасць з прахаладай неразумення. Лёгка ранімы Мадыльяні ўтапіў свае скульптуры ў гарадскім канале.

Сапраўднае прызнанне ён атрымоўваў ад жанчын, якія інтуітыўна адчувалі моц яго гарманічнага жывапісу. Аднак ні да аднаой сваёй сяброўкі ён не змог прывязацца настолькі, каб у выніку атрымалася нармальная сям'я. У адрозненне ад яго, Пікасо быў жанаты чатыры разы, не лічачы грамадзянскіх шлюбаў.

Ва ўсіх хроніках жыцця геніяльнага іспанца пазначаныя жанчыны, якія аказвалі ўплыў на ягоную творчасць. З 1905 па 1912 год яго сяброўкай была Фернанда Аліў'е, пасля — Марсель Убэр, у 1918 годзе ён пазнаёміўся з балерынай Вольгай Хахловай, якая ў 1921 годзе падаравала яму сына Поля, у 1931 годзе яго музай стала Марыя-Тэрэза Вальтэр, ад якой у Пікасо была дачка Майя, ад Францызы Жыло Пікасо меў дзяцей Клода (1947 год) і Палому (1949 год). Ягонай апошняй выбранніцай стала Жаклін Рос, з якой ён пасябраваў у 1954 годзе, а ўступіў у шлюб у 1961. Здаецца, толькі Шагал быў арыентаваны на традыцыйныя каштоўнасці. У 1909 годзе ён пазнаёміўся з Бэлай Розенфельд, праз шэсць гадоў яны сталі мужам і жонкай і пражылі разам да 1944 года, калі Бэла памерла ў Нью-Йорку. У 1952 годзе Марк Шагал ажаніўся з Валянцінай Бродскай, разам яны сустрэлі глыбокую старасць.


Пікасо і Шагал атрымалі прызнанне сучаснікаў адразу. Мадыльяні, падобна Гагену, заваяваў прызнанне свайго таленту пасля смерці. Невыпадкова на яго надмагіллі выбіты надпіс: «Ён памёр на парозе славы!» Мадыльяні памёр ад туберкулёзнага менінгіту 24 студзеня 1920 года, а ранкам наступнага дня з акна 5-га паверха выкінулася яго каханка Жанна Эбютэрн, якая была на апошнім месяцы цяжарнасці. За 14 месяцаў да гэтага ў Мадыльяні і Жанны нарадзілася дачка Джаванна. Няшчасная дзіця, у адзін дзень пакінутае бацькамі, выхоўвалі бабулі. У тую трагічную ноч узрушаную Жанну пільнаваў брат, бо яна тройчы спрабавала адчыніць акно. Уначы Жанна дачакалася, калі брата зморыць сон, і выканала сваё жаданне. Брат паспеў да акна, калі Жанна была ўжо ў паветры. На могілкі Пэр-Лашэз Амадэо Мадыльяні праводзіў увесь Парыж. На пахаванні Жанны на сціплых могілках на іншым канцы Парыжа прысутнічала некалькі сяброваk. Толькі праз некалі гадоў яе прах пакалі побач з Мадыльяні.

Увага да Мадыльяні абудзілася пасля яго смерці. Прыжыццёвы жыццё ў бедна сці, ён сваёй творчай спадчынай узбагаціў не адно пакаленне гандляроў карцінамі.

Калі б не слабое здароўе, Мадыльяні, відаць, па маштабе зробленага стаяў бы побач з сябрамі сваіх маладых гадоў.

Пабла Пікасо перажыў Мадыльяні на 53 гады. Яшчэ ў 87-гадовым узросце ён выканаў за 7 месяцаў 347 гравюр — па 50 у месяц.

Шагал у 94 гады заканчваў вітражы для сабора ў Сент-Эцьене. Ён сканаў за два гады да свайго 100-годдзя. ■



Мадыльяні больш за ўсё любіў жывапіс і жанчын

АДУКАЦЫЯ

Куды пайсці вучыцца

Хутка пачнецца новы навучальны год. У НАВІНАЎ многа чытачоў, у чыіх сем'ях прывячаецца беларускамоўная адукацыя. Каб дапамагчы бацькам знайсці патрэбную для іхніх дзяцей навучальную ўстанову, НАВІНЫ друкуюць спіс беларускмоўных школаў і дзіцячых садкоў у кожным раёне горада Мінска. Гэтую інфармацыю даслала Упраўленне адукацыі Мінгарвыканкама.

У 1998/99 навучальным годзе статус беларускамоўных захавалі 11 школ:

район	*колькасць*	*нумар школы*
Заводскі р-н	*2*	*(СШ 68, гімназія № 111)*
Кастрычніцкі р-н	*2*	*(СШ № 11, СШ № 89)*
Ленінскі р-н	*1*	*(СШ № 2)*
Маскоўскі р-н	*1*	*(СШ № 60)*
Партызанскі р-н	*1*	*(СШ № 72)*
Першамайскі р-н	*2*	*(гімназія № 9, СШ № 190)*
Фрунзенскі р-н	*1*	*(гімназія № 4)*
Цэнтральны р-н	*1*	*(мастацкая школа-ліцэй № 26)*

У вышэйназваных школах, пачынаючы з падрыхтоўчага класа і да старэйшых, навучальна-выхаваўчы працэс цалкам вядзецца на беларускай мове. Напрыклад, у СШ № 2 да 7 класа, у СШ № 68, № 11, № 72 да 8 класа, у гімназіі № 4, школе-ліцэі № 26 да 9 класа, у гімназіі № 111, СШ № 89, гімназіі № 9, СШ № 190 да 10 класа.

Апрача беларускамоўных школ, у 119 сярэдніх школах з рускай мовай навучання адкрыта 1.236 беларускамоўных класаў. Была захаваная значная колькасць такіх класаў з напаўняльнасцю 6—14 чалавек, што пярэчыць рашэнню Мінгарвыканкама № 572 ад 10.07.97 г. «Аб мерапрыемствах па эканоміі бюджэтных і пазабюджэтных сродкаў у 1997 годзе», згодна з якім класы пачатковай школы павінны адкрывацца пры напаўняльнасці не менеей як 25 чалавек, а класы сярэдняй і старэйшай школы — не менеей як 30 чалавек.

З мэтай захавання сеткі класаў з беларускай мовай навучання органы адукацыі, кіраўніцтва школаў, педагагічныя калектывы напярэдадні навучальнага года праводзяць тлумачальную работу сярод бацькоў вучняў беларускіх класаў.

Для таго, каб забяспечыць пераемнасць у вучэбна-выхаваўчым працэсе, у горадзе функцыянуе 13 беларускамоўных садкоў, 154 беларускія групы. Па раёнах гэта выглядае наступным чынам:

Раёны	*дзіцячыя ўстановы*	*групы*	*тэлефон для даведак*
Заводскі	*3 (№ 443, 277, 202)*	*18*	*246-53-40*
Кастрычніцкі	*1 (№ 287)*	*52*	*224-49-68*
Ленінскі	*5 (№ 47, 299, 374, 446, 454)*	*14*	*221-83-16*
Маскоўскі	*—*	*15*	*270-39-71*
Партызанскі	*3 (№ 69, 114, 457)*	*3*	*236-90-71*
Першамайскі	*1 (№ 539)*	*21*	*285-77-79*
Савецкі	*—*	*24*	*284-91-69*
Фрунзенскі	*—*	*7*	*254-72-81*
Цэнтральны	*—*	*4*	*284-71-22*

ЦЫВІЛІЗАЦЫЯ

Надувание презервативов — лучшее средство от СПИДа

Елена САВИНА

В Китае разработана новая методика полового просвещения молодежи в непринужденной обстановке, подразумевающей «более тесное взаимодействие между преподавателем и студентом».

В целях усиления заинтересованности студентов в данном образовании преподаватель может предложить самым застенчивым надуть презерватив, как воздушный шарик, «чтобы он или она привыкли к этому распространенному противозачаточному средству». Подобные занятия предназначены для студентов первого курса университетов Пекина и Шанхая.

Из-за размаха эпидемии СПИДа китайские власти были вынуждены отказаться от традиционного запрета обсуждения темы секса в обществе. По данным официальной статистики, число зараженных вирусом иммунодефицита человека китайцев достигло 400 тысяч. При этом эксперты министерства здравоохранения признают, что в действительности количество зараженных этой болезнью может быть больше. ■

INTERNET

Хакерам будет кому помолиться

Егор ИВАНОВ

Ватикан серьезно рассматривает возможность «предоставления» святого покровителя всемирной компьютерной сети Интернет. Теперь, отправляя электронное письмо своему корреспонденту в далекой стране, можно будет обратиться с молитвой к святому Исидору. Именно он стал главным кандидатом на роль покровителя Интернета.

Святой Исидор жил в Испании в период около 560 - 636 годов. Этот эрудированный человек, спасая античную культуру, написал двадцатитомную энциклопедию, в которой зафиксировал мировые знания.

В идее назначить святого Интернету нет ничего удивительного: Ватикан выбирает покровителей любой области человеческой деятельности. ■

ЗОРКІ



Фота IREX/ProMedia

У белорусских девчонок свой кумир — Леонардо ДиКаприо

Том Хенкс — самый коммерческий актер в США

Егор ИВАНОВ

Том Хенкс занимает первое место среди американских актеров, способных своим участием обеспечить коммерческий успех фильма. К такому выводу пришла редакция газеты *Hollywood Reporter*.

Это исследование ежегодно проводится уже в течение пяти лет. В текущем году сотрудники газеты попросили 135 руководителей предприятий, имеющих отношение к развлекательной индустрии, составить рейтинг 525 ведущих актеров с точки зрения их способности обеспечить финансирование фильма или привлечь зрителей в кинотеатры.

В результате список возглавил Том Хенкс, опередивший Мэла Гибсона, Тома Круза (который занимал первое место в этом списке в прошлом году), Харрисона Форда, Джима Кэрри, Леонардо ДиКаприо, Джона Траволту, Джулию Робертс (единственную женщину, вошедшую в первую десятку актеров), Робина Уильямса и Брэда Питта. ■

ФЕСТЫВАЛЬ

Расійскія «зоркі» на «Славянскім базары» будуць каштаваць 10 мільёнаў рублёў

Марына КУНОЎСКАЯ

У Віцебску распачаўся продаж білетаў на канцэрты Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Сёлета цэны фестывальных білетаў цалкам параўнальныя з коштам наведвання гастрольна-канцэртных мерапрыемстваў у сталічных канцэртных залах. Так, лепшыя месцы ў амфітэатры на выступленні расійскіх «зорак» Філіпа Кіркорава і Валерыя Ляонцьева, а таксама на цырымоніях адкрыцця і закрыцця фестывалю каштуюць да 10 млн. рублёў. Сольныя канцэрты Сафіі Ратару і Ларысы Долінай абыдуцца іхнім прыхільнікам у 2—7 млн. рублёў, іншыя праграмы з удзелам «зорак» — ад 1 да 5 мільёнаў. «Сацыяльныя цэны» — ад 300.000 беларускіх рублёў — устаноўленыя толькі на канцэрты конкурсу маладых выканаўцаў, праграму расійскага фестывалю «Казачий круг», украінскую праграму і гала-канцэрт маладых удзельнікаў фестывалю. Сёлета выступаў «зорак» эстрады на вулічных пляцоўках не чакаецца; на сцэне, размешчанай на плошчы Свабоды, абяцалі выступіць толькі група «Балаган лімітэд», кампазітар Мікалай Дабранраваў, паэт Аляксандр Шаганаў і шматлікія фальклорныя калектывы. ■

© НАВІНЫ. Спасылка на газету НАВІНЫ абавязковая. Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў, публікаваць артыкулы дзеля палемікі Адрас: г.Мінск, пр-т газеты «Известия», 8-173. Пасведчанне аб рэгістрацыі № 996
Выдаецца з 16 студзеня 1998 г. В.а. галоўнага рэдактара і заснавальнік Павел Жук. Выдавец — рэдакцыя газеты НАВІНЫ. Адрас для карэспандэнцыі: 220034, г. Мінск, вул. З.Бядулі, 6-47. Тэл./факс: 236-89-40.
E-mail: NPSvaboda@irex.minsk.by Надрукавана на паліграфічнай фабрыцы «Чырвоная зорка» (г.Мінск, 1-шы Загарадны завулак, 3) Заказ 572 Нумар падпісаны ў друк 15/07/99 (15:00) Наклад — 21.110